**Літаратура.**

1. Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Віцебшчыны / склад.: А. С. Дзядова, Г. К. Семянькова ; пад рэд. А. С. Дзядовай. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2025. – 108 с.

УДК 398:636.92

## ТРУСЫ Ў МІФАЛОГІІ НАРОДАЎ СВЕТУ

**Громава І.І., Баушына Ю.У.**
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

*У працы разглядаецца значэнне сімволікі труса ў міфах і легендах розных народаў. Асэнсаванне сімволікі неабходна для разумення культурных кодаў, дазваляе глыбей успрымаць фальклор, літаратуру, і нават сучасныя брэнды, якія выкарыстоўваюць гэты вобраз (напрыклад, знак якасці ў касметыцы, які абазначае одсутнасць тэсціравання на жывёлах). Разуменне вытокаў узбагачае аналіз культуры, народныя традыцыі, рэлігію.* ***Ключавыя словы:*** *міф, сімвал, месяцовы трус, велікодны трус, неўміручасць, ступка.*

## RABBITS IN THE MYTHOLOGY OF THE NATIONS OF THE WORLD

**Gromova I. I., Baushina Yu.V.**
Vitebsk State Academy of Veterinary Medicine, Vitebsk, Republic of Belarus

*The paper examines the significance of rabbit symbolism in myths and legends of different nations. Understanding the symbolism is necessary to interpret cultural code, and allows a deeper understanding of folklore, literature, and even modern brands that use this image (for example, a quality mark in cosmetics that indicates the absence of animal testing). Understanding of origins enriches the analysis of culture, folk tradition and religion.* ***Keywords:*** *myth, symbol, moon rabbit, Easter bunny, immortality, mortar.*

**Уводзіны.** Ад старажытных легенд да сучасных традыцый трус займае асаблівае месца ў міфалогіі народаў свету. Гэта не проста жывёла, а сімвал, які нясе глыбокі сэнс і перадае мудрасць пакаленняў. Ён увасабляе ўрадлівасць, багацце, адраджэнне і даўгалецце.

**Матэрыялы і метады даследаванняў.** Была вывучана пэўная колькасць літаратуры па тэме, вызначаны самыя папулярныя легенды пра трусаў у розных народаў, у розных рэлігіях, міфы ад Амерыкі да Кітая. Артыкул грунтуецца на комплексе агульнанавуковых и спецыяльных

метадаў: семіятычны аналіз, параўнальна-супастаўляльны, апісальны метады.

**Вынікі даследаванняў.** У міфалогіі трус звязаны з Месяцам, зменай жыцця і смерці, а таксама сімвалізуе хуткасць, асцярожнасць, самаахвяраванне і ўдачу [1].

Японія: месяцовы трус і поспех. У японскай міфалогіі трус – гэта шанаваная істота, звязаная з Месяцам. Маленькая істота таўчэ моці ў ступцы, што звязана са святам Цукімі (любаванне месяцам), і сімвалізуе самаахвяраванне, адраджэнне, урадлівасць і поспех. Ёсць яшчэ адзін міф пра Белага Труса з Інабы, які дапамог багіні Аматэрасу знайсці шлях, стаўшы аб'ектам шанавання ў храмах. Трусы таксама сімвалізуюць «поспех» і «багацце» дзякуючы сваім доўгім вушам, якія «збіраюць гэтае багацце».

Кітай: багіня месяца і неўміручасць. У Кітаі трус лічыўся адвечным спадарожнікам начной багіні Чан-э, за што таксама стаў называцца месяцовым трусам. Ён адправіўся з ёй на Месяц, дзе і пасяліўся. Яшчэ ў перыяд праўлення дынастыі Хань вушасты ўвасабляў жаночы пачатак «інь». Кітайцы верылі, што месяцовы, або нефрытавы, трус Юэту жыве на Месяцы і рыхтуе чароўны эліксір неўміручасці. Паколькі на ўсходзе лічылася, што трус дорыць неўміручасць, кітайскія імператары малявалі яго на эмблемах улады. Гэта было залогам даўгалецця царскай асобы.

Індзейцы: герой – трус Манабазо. У паўночнаамерыканскіх індзейцаў трус – гераічная фігура. Алганкіны звязвалі яго з Богам Мічыабо – сынам заходняга ветру, дарыльшчыкам святла. Цудоўныя лапы труса рабілі яго выдатным плыўцом. Трус Манабазо, як старажытнагрэчаскі Праметэй, выкраў агонь у грозных духаў і аддаў яго людзям зямным. Таму тут трус і заяц увасабляюць святло, сонца, світанак, творчы сусветны пачатак, змяняючы звярыную прыроду на прыроду чалавека. У пазнейшых індзейскіх міфах ён ператвараецца ў героя-храбраца, пануе над вятрамі або дарует людзям дождж. Ён спрытны і кемлівы, розумам перамагае грубую сілу.

Славяне: мудрасць і шчасце. Ва ўсходніх славян таксама існавалі падобныя павер'і пра трусаў. Гэта жывёла была шчаслівай для цяжарных жанчын. Злавіць у сне труса або зайца прадвесціла лёгкія роды і нараджэнне хлопчыка.

У казках ён нярэдка супрацьпастаўляецца лісе, якая ўвесь час спрабуе абхітрыць яго і з'есці. Але яе каварным планам не наканавана спраўдзіцца: хай трус маленькі і слабы, затое ён мудры і знаходлівы. Галоўны пасыл такіх паданняў заключаецца ў тым, што сілу заўсёды можна перамагчы розумам, а каварства – мудрасцю і знаходлівасцю [2].

Германія: велікодны трус. У язычніцкай Германіі пушысцік, таксама як і яйка, быў сімвалам урадлівасці, новага жыцця, адраджэння. Гэта звязала яго і з хрысціянскай велікоднай сімволікай, са святам вясны, Уваскрашэння Хрыста і пачаткам новага жыцця. Таксама там была багіня

вясны і ўрадлівасці – Эостра. Часам яна адлюстроўвалася з трусінай галавой. Яе ўшаноўвалі ў дзень вясновага раўнадзенства.

Хрысціянства: двайны сімвал. Пушысцік з'яўляецца і ў хрысціянскай сімволіцы. Ён сімвал заганы і граху. Часам пакорлівы белы Вушасцік малюецца ля ног Панны Марыі. Гэта сімвал перамогі над распустай. Безабароннасць і пакора гэтай жывёлы таксама сімвалізуе падзвіжнікаў Хрыста, якія даверыліся яму. Велікодны трус – традыцыйная велікодная жывёла ў многіх еўрапейскіх краінах. Больш за тое, ён нясе прыгожыя велікодныя яйкі і пакідае іх у падарунак добрым дзецям.

Будызм: самаадданасць і спачуванне. У будызме трус – гэта сімвал найвышэйшай самаадданасці і шчодрасці, заснаваны на легендзе пра тое, як ён скокнуў у вогнішча, каб накарміць галоднага Буду, за што быў узнесены на Месяц і стаў месяцовым трусам, які таўчэ эліксір неўміручасці. Гэтая гісторыя, вядомая як «Легенда аб чатырох гарманічных жывёлах», падкрэслівае бескарыслівасць і спачуванне, а трус з'яўляецца ўвасабленнем гэтых якасцяў [3].

**Заключэнне.** У краінах Азіі трус амаль заўсёды жыве на Месяцы, у яго лапах ступка, а сам ён абавязкова звязаны з бажаством. У хрысціянстве яго значэнне неадназначна. З аднаго боку, ён сімвал распусты, з другога – чысціні душы. Вясной труса заўсёды можна ўбачыць як сімвал Вялікадня. У цэлым, трус усюды пазначаецца больш станоўчым і добрым сімвалам, чым дрэнным.

**Літаратура.**

1. Афанасьев, А. Н. Мифы древних славян / А. Н. Афанасьев. – Москва : Array Литагент «РИПОЛ», 2014. – 290 с.

2. Колум П. Великие мифы народов мира / Патрик Колум. – Москва : Центрполиграф, 2007. – 352 с.

3. Токарев, С. А. Мифы народов мира : Энциклопедия в 2 томах / Гл. ред. С. А. Токарев. – Москва : Советская Энциклопедия, 1987-1988. – 1392 с.

УДК 37.018.1(476)

# ТРАДИЦИИ ВОСПИТАНИЯ В БЕЛОРУССКОЙ СЕМЬЕ КАК ЭЛЕМЕНТ СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА

**Дятко Е.А., Картунова А.И.**
УО «Витебская ордена «Знак Почета» государственная академия ветеринарной медицины», г. Витебск, Республика Беларусь

*В статье рассматриваются элементы социально-культурного наследия белорусского народа, воплощенные в народных традициях воспитания и взаимоотношений в белорусской семье, которые*